Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

# ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

№ 24 (5150)
СТУДЗЕНЬ
28
ПАНЯДЗЕЛАК
1935 г.
год выдання XVIII

## Учора краіна хавала таварыша Валерыяна Уладзіміравіча КУЙБЫШЭВА

# ЖАЛОБНЫ МІТЫНГ НА КРАСНАЙ ПЛОШЧЫ

**Тав. ЧУБАР.**—Таварышы, траурны мітынг, прысвечаны памяці Валерыяна Уладзіміравіча Куйбышэва, абвяшчаю адкрытым. Ад Цэнтральнага Камітэта ВКП(б) і Совета Народных Камісараў Саюза слова мае старшыня Соўнаркома СССР т. **Молатаў.**

## Прамова тав. Молатава

З нашых радоў смерць вырвала Валерыяна Уладзіміравіча **Куйбышэва.**

Совецкі Саюз, рабочы клас і партыя страцілі аднаго з сваіх лепшых дзеячоў, злучаўшага ў сабе глыбокае разуменне складаных дзяржаўных і партыйных спраў з беззаветнай адданасцю пролетарскай рэволюцыі.

Мы, бліжэйшыя яго саратнікі па барацьбе за комунізм, страцілі чулага друга, баявога таварыша крыштальнай душэўнай чыстаты.

Тав. **Куйбышэў** пачаў сваё рэволюцыйнае жыццё юнаком 30 гадоў таму назад. Стаўшы яшчэ тады ў рады большэвікоў, Валерыян Уладзіміравіч быў заўсёды верным партыі і да канца, да моманту смерці, на слаўным баявым пасту, захоўваў беззаветную адданасць партыі Леніна-Сталіна.

Мы ведаем тав. **Куйбышэва** ў дарэволюцыйныя гады, як прафесіянала-рэволюцыянера ленінскай школы, як будаўніка большэвіцкага падполля, як арганізатара ра-цыйнага трацкізма і яго ахвосця — зіноўеўшчыны, ён — нястомны будаўнік нашай буйнай прамысловасці і кіраўнік работы па складанню 2-га пяцігадовага плана, урэшце — першы намеснік старшыні Совета Народных Камісараў Совецкага Саюза, дзе яго выдатная роля ва ўсіх на вачах.

Мы, працаваўшыя з ім побач да апошняга дня, будзем асабліва балюча і доўга адчуваць страту Валерыяна Уладзіміравіча, якога ўсе, добра яго ведаўшыя, горача любілі.

Ён нёс на сабе велізарную работу з вялікай скромнасцю і заўсёды ў малых і вялікіх справах праяўляў разуменне карэнных інтарэсаў соцыялізма і ўменне ўвайсці ў іх канкрэтныя асаблівасці і ў становішча паасобных работнікаў. Яго адносіны да партыйных і дзяржаўных абавязкаў заўсёды будуць для нас узорам рэволюцыйнай самаадданасці і большэвіцкай вернасці справе.

Цяжкім ударам для нас, для партыі і працоўных была страта Сергея Міронавіча Кірава ад рукі злачэя ў Ленінградзе.

З глыбокім смуткам мы развіт-



энергіі палкага большэвіка-ленінца. Усе даручэнні партыі Валерыян Уладзіміравіч заўсёды выконваў з адданасцю і веданнем справы, усюды ўмеў праявіць сябе стойкім, непахісным і беззаветна адданым барацьбітом за справу Леніна-Сталіна, талентлівым кіраўніком і арганізатарам.

Таварышы, з нашых радоў ушоў заўсёды бадзёры таварыш, друг і кіраўнік. Але няхай не радуюцца ворагі гэтай нашай страце. Вазмясцім яе яшчэ большай згуртаванасцю вакол нашай партыі, вакол т. **Сталіна.** Мы пойдзем да новых перамог пад кіраўніцтвам нашай партыі.

Прашчай, наш дарагі, наш родны Валерыян Уладзіміравіч! Справа, за якую ты так самаадданна змагаўся, будзе намі пад кіраўніцтвам т. **Сталіна** даведзена да канца.

## Прамова тав. Ікрамава

Таварышы, наша партыя і рабочы клас страцілі ў асобе таварыша **Куйбышэва** аднаго з лепшых сваіх сыноў, аднаго з лепшых саратнікаў і вучняў Леніна і Сталіна. Мы страцілі аднаго з буйнейшых дзеячоў нашай дзяржавы. Гэта страта для нас, комуністаў, рабочых і калгаснікаў Сярэдняй Азіі, асабліва цяжка таму, што мы яшчэ з канца 1919 года вучыліся ў тав. Куйбышэва, як змагацца за справу Леніна і Сталіна. Мы страцілі ў асобе т. Валерыяна Куйбышэва аднаго з лепшых праваднікоў нацыянальнай палітыкі Леніна і Сталіна.

Валерыян Уладзіміравіч яшчэ нядаўна прыязджаў у Сярэднюю Азію, у прыватнасці ў Узбекістан. На працягу паўтара месяца ён выпраўляў нашы памылкі, мабілізоўваў усю партарганізацыю, рабочыя і калгасныя масы на барацьбу за бавоўну. І дзякуючы яго дапамозе, мы вышлі з прарыву. Ён не толькі кіраваў нашай агульнай работай, але ў кожным калгасе і на паасобных памылках вучыў нас, як трэба працаваць. Развітваючыся з дарагім тав. Куйбышэвым, нашым дэлегатам на Ўсесаюзны з'езд советаў, мы гаворым:

— Прашчай, наш дарагі таварыш і настаўнік! Мы, большэвікі Узбекістана, рабочыя і калгаснікі, будзем верны партыі Леніна-Сталіна. Мы таксама як і ты будзем працаваць пад кіраўніцтвам сталінскага ЦК, бо ў гэтым зарука далейшых поспехаў у пабудове соцыялізма.

## Прамова тав. Петроўскага

Таварышы, ад ЦК партыі большэвікоў Украіны і ўрада, ад імя дэлегатаў, прыехаўшых на ўсеса-

зіноўеўцаў—у жалезнай кагорце большэвікоў ён заўсёды стаяў на перадавых пазіцыях

## Прамова тав. Атабаева

Таварышы, ад нас ушоў большэвік, верны ленінец-сталінец, адзін з буйнейшых арганізатараў пролетарскай рэволюцыі. Смерць абарвала выдатнае жыццё.

жыў пачатак саветызацыі нашага края.

Тав. Куйбышэў ніколі не траціў сувязі з працоўнымі рэспублік Сярэдняй Азіі. Многімі сваімі да-

